**24 студзеня 2023 г. - 70 гадоў з дня нараджэння УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ДЗЕХЦЕРУКА (1953) - літаратара, паэта, дзеяча беларускай дыяспары ў Эстоніі**

Уладзімір Іванавіч Дзехцярук нарадзіўся 24 студзеня 1953 года ў в. Павіцце Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Цёплыя бацькоўскія адносіны, разнастайнасць інтарэсаў бацькі Івана Аляксандравіча – даследчыка, мовазнаўца, і яго патрабавальнасць у выхаванні дзяцей з’явіліся добрым падмуркам для развіцця творчай натуры будучага паэта.



Пасля заканчэння Павіццеўскай сярэдняй школы Уладзімір Дзехцярук паступіў у Брэсцкі чыгуначны тэхнікум, які скончыў у 1972 годзе. На першае працоўнае месца быў накіраваны ў Казахстан. Працаваў электрамеханікам і начальнікам маленькай чыгуначнай станцыі ў Сары-Шаганскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі. Вясной 1973 года прызваны на службу на Ціхаакіянскі флот. Ва Уладзівастоку скончыў курс вучэбнага атрада падводнага плавання, служыў на атамнай падводнай лодцы.

Пасля дэмабілізацыі Уладзімір Дзехцярук вярнуўся ў Беларусь, у 1976 годзе стаў студэнтам факультэта «Аўтаматыка, тэлемеханіка і сувязь» Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. У час вучобы ўдзельнічаў у пяці студэнцкіх будаўнічых атрадах, якія працавалі ў Беларусі, Карэліі, Комі, Сібіры.

Пасля заканчэння інстытута па размеркаванні накіраваны ў Эстонскую ССР, дзе працаваў у пагрузачна-транспартным упраўленні вытворчага аб’яднання «Эстонсланец». За пяць гадоў работы на аб’яднанні прайшоў шлях ад электрамеханіка да начальніка ўчастка. З першых месяцаў жыцця ў Эстоніі ён актыўны ўдзельнік культурных мерапрыемстваў на сваім прадпрыемстве і г. Кохтла-Ярве. Ён капітан каманды ў конкурсе «А ну-ка, шахцёры!». На старонках мясцовай газеты з’яўляліся яго артыкулы і вершы, якія заўсёды адрозніваліся актуальнасцю, добрым веданнем справы.

У 1988 г. разам з А. Лапышавым, С. Сотчанка, Л. Валуём і К. Станкевічам Уладзімір Дзехцярук распачаў беларускі рух у Эстоніі, быў абраны ў раду Беларускага культурнага згуртавання г. Таліна. Праз год стварыў у г. Кохтла-Ярве Беларуска-эстонскае згуртаванне «БЭЗ», быў яго старшынёй да 1992 года. У 1998 годзе добраахвотна выйшаў з БЭЗа і пачаў супрацоўнічаць са згуртаваннем беларусаў «Спадчына» ў г. Нарва. Доўгі час дапамагаў рабіць радыёперадачы на хвалях «Бацькаўшчыны» для беларусаў Эстоніі, быў дэлегатам З'езда беларусаў бліжняга замежжа.

Інтарэсы нашага земляка шматгранныя: аматар веласіпедных падарожжаў, гістарычны даследчык, захапляецца краязнаўствам, геаграфіяй і гісторыяй Эстоніі. Арганізаваў паездку эстонскага камернага хору ў Гомель, веласіпедныя вандроўкі з Эстоніі ў Беларусь. Для гасцей з Беларусі наш зямляк заўсёды гатовы правесці на беларускай мове экскурсію ў любы куток Эстоніі.

Уладзімір Дзехцярук таксама таленавіты літаратар. Адзіны беларускі паэт на ўсю вялікую Эстонію, ён патрабавальны да сваёй музы, пра што сведчыць і яго творчасць. Друкаваўся ў газетах «Беларус» (ЗША), «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», «Эстония», «Молодёжь Эстонии», «Северное побережье», «Боевая вахта», «Кобрынскі веснік» і інш. У 1995 годзе ў талінскім выдавецтве «Інгры» выдаў першую кніжку вершаў і апавяданняў «Сярод белых эстонскіх начэй», якая змяшчае вершы аб Эстоніі і Беларусі, замалёўкі, роздумы. Простыя, але шчырыя і пранізлівыя радкі гавораць больш, чым многія гучныя выказванні і сведчаць аб сапраўдным таленце.

Бе-ла-русь - вельмі ёмкае слова!
У ім Купалле, Каляды, Дзяды,
У ім і наша пявучая мова,
І вякоў неўміручых сляды.
Побач з ёю сябе адчуваю,
Да яе прыязджаю заўжды,
Прыгарнуся і зноў ажываю,
Быццам вып’ю гаючай вады.

У 1999 годзе У. І. Дзехцярук надрукаваў другую кніжку вершаў «Трылабітавы бераг», у 2000 годзе - кнігу прозы «Кроплі лёсу». У гэтых кнігах вершы розных гадоў, невялікія апавяданні, апісанні сустрэч з цікавымі людзьмі, выпадкаў з

жыцця, успаміны аб студэнцкіх гадах і будаўнічых атрадах, замалёўкі аб маляўнічых месцах Эстоніі.

Чацвёртую кнігу «Повіць, абшары, людзі, час» (2005) Уладзімір Іванавіч цалкам прысвяціў роднай вёсцы. У ёй аўтар выкарыстаў багаты матэрыял, які быў сабраны некалі бацькам. Гэта запісы аб шматлікіх падзеях, што ў розныя часы адбываліся на тэрыторыі вёскі і паблізу яе, аб людзях з незвычайным лёсам, старыя фотаздымкі і г. д. Уладзімір Дзехцярук дапоўніў звесткі бацькі ўласнымі цікавымі знаходкамі не толькі ў межах роднага кутка, але і ў іншых месцах і асабліва ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Праз усю лірыку Уладзіміра Дзехцерука праходзяць вобразы роднай Беларусі. Шчырая любоў да Бацькаўшчыны, боль за яе мінулае, трывога за будучыню, за пакутлівы лёс роднай мовы, заклік да беларусаў адрадзіць пачуццё нацыянальнай годнасці - усё гэта ў шматлікіх вершах і апавяданнях аўтара. А яшчэ тонкі гумар і глыбокі роздум аб агульначалавечых праблемах і каштоўнасцях.

Разумны, талерантны беларус шануе народ Эстоніі, дзе наканавана жыць, і любіць Беларусь. Час ад часу Уладзімір Іванавіч наведвае родныя мясціны, бывае не толькі ў родным Павіцці, але і ў адметных куточках рэспублікі. Улетку ён звычайна сядае на веласіпед і едзе цераз усю Прыбалтыку ў Беларусь, на родную Кобрыншчыну (1300 км!). Паводле слоў Уладзіміра Дзехцерука, адной з важных мэт яго велатураў з’яўляецца наладжванне адносін паміж народамі. «Ведаць сваю мінуўшчыну, памятаць пра свае карані - гэта, на мой погляд, галоўнае. Таму што, куды б ні закінуў нас лёс, у душы мы ўсё роўна назаўсёды застанемся беларусамі...», - лічыць Уладзімір Дзехцярук.

Лёс Уладзіміра Іванавіча Дзехцерука - гэта лёс сотняў і тысяч беларусаў, якія апынуліся за межамі Радзімы, але не здрадзілі ёй сэрцам і думкамі. У іх, як і ў паэта, не раз сціскаецца сэрца ад думкі:

Беларусь! Ты далёка- далёка...
Не разблытаць жыццёвы клубок...
Я стаю, а па небе аблокі,
Быццам думкі, плывуць у твой бок.

*«Сярод белых эстонскіх начэй»*

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

### *Творы У. І. Дзехцерука*

**Дзехцярук, У.** Сярод белых эстонскіх начэй / Уладзімер Дзехцярук ; укладальнік і рэдактар Маргарыта Астраумава. - Талін : ІНГРІ, Згуртаванне беларускай культуры (БЭЗ), 1995. - 208 с.

**Дзехцярук, У.** Крыніцы : прызнанне ў любові / Уладзімір Дзехцярук // Земля и люди Повитья. - Минск, 2014. - С. 44.

**Дзехцярук, У**. Беларусам ; Прыкметы ; Набалелае ; Малітва : [вершы] / Уладзімір Дзяхцярук // Кобрынскі веснік. - 2005. - 3 верасня. - С. 8.

**Дзехцярук, У**. Начныя вершы. 1989 год / Уладзімір Дзяхцярук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 17 жніўня. – С. 3.

### *Аб жыцці і дзейнасці У. І. Дзехцерука*

**Дзехцярук Уладзімір Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 433. - (Імі ганарацца землякі).

**Земля и люди Повитья** / автор текста Н. С Васюк ; ред. П. Н. Тишук. – Минск, 2014. – 44 с. : фото.

**Вядомыя землякі. Дзехцярук Уладзімір Іванавіч** // Малой радзімы прыцяжэнне : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 475-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах вёсак Павіцце і Лелікава Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2021. - С. 20-22 : фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**70 гадоў з дня нараджэння У. І. Дзехцерука (1953)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 84.

**Марціновіч, Д.** Беларуская Эстонія : суайчыннікі ў свеце / Дзяніс Марціновіч // Літаратура і мастацтва. - 2012. - 20 студзеня (№ 3). – С. 20.

У Эстоніі жыве беларускамоўны пісьменнік Уладзімір Дзехцярук, аўтар кнігі вершаў і апавяданняў «Сярод белых эстонскіх начэй».

**Пянко, А.** Песня не ведае межаў / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2010. - 4 верасня. - С. 9.

Уладзімір Дзехцярук наведаў Беларусь у цудоўнай кампаніі эстонскага харавога калектыву «Поолкуу».

**Бялоў, Д.** Ад Эстоніі – да Беларусі / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 5 жніўня. - С. 2.

Восем гадоў падарожнічае У. Дзехцярук, ураджэнец в. Павіцце, на веласіпедзе па такому маршруту.

**Аляксандраў, А**. Тысячы кіламетраў на веласіпедзе / Аляксей Аляксандраў // Кобрынскі веснік. - 2006. - 12 ліпеня.

Падобныя паездкі на веласіпедзе з Эстоніі ў Павіцце здзяйсняе У. Дзехцярук.

**Хільчук, М.** Чатыры кнігі земляка / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. -2005. - 17 жніўня. - С. 3.

Аб творчасці У. Дзехцерука.

**Ратман, Р**. Увлеченный человек : Владимир Дехтярук – историк-любитель, краевед-велосипедист и двуязыкий стихотворец / Рауль Ратман // Шахтер Эстонии. - 2003. - 4 апреля.

**Скобла, М.** Уладзімір Дзехцярук / Міхась Скобла // Звязда. - 2002. - 6 красавіка. - С. 4.

**Базылюк, А.** Сустрэча з паэтам-земляком / А. Базылюк // Кобрынскі веснік. - 1999. - 29 верасня.

Пра сустрэчу з беларускім паэтам У. І. Дзехцеруком (Эстонія) у Павіцьеўскім СДК.

**Хільчук, М**. Доўгі шлях дадому : Кнігі нашых землякоў / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. - 1999. - 2 кастрычніка. - С. 4.

Лёс і творчасць У. Дзехцерука.

**Остроумова, М**. «Сярод белых эстонскіх начэй» : нашы землякі / Маргарита Остроумова // Кобрынскі веснік. - 1996. - 10 студзеня (№ 2). - С. 2.

Упершыню ў Эстоніі выйшла кніга на беларускай мове – зборнік У. Дзехцерука «Сярод белых эстонскіх начэй».

**Вечар, А.** Жыве ў Эстоніі беларус… : слова пра земляка / Алесь Вечар // Камуністычная праца. - 1990. - 11 жніўня. – С. 4.

Кобрынскі раён
Павіцце
Дзехцярук Уладзімір Іванавіч
Грамадскія дзеячы
Паэты
Літаратары
Краязнаўцы